Нядаўна
версітэце
дзень завоч
ты сустрака
лі з метад
кладчыкамі, здавалі экзамены.

НА ЗДЫМКУ: экзамен па англійскай мове здае студэнт-завочнік III курса геаграфічнага факультэта Барыс Усаў. Старшы выкладчык Лідзія Якаўлеўна Малышава задаволена: студэнт адказвае выдатна.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.

## ЧЫТАЙЦЕ Ў НУМАРЫ:

● ЗВАРОТ ДА СТУДЭНТАЎ РЭСПУБЛІКІ ● **ГАРЫЗОНТЫ ПРАФСАЮЗНАГА ЖЫЦЦЯ** ● ІНТЭРВ'Ю З ВЫДАТНІКАМІ ● **ІДЗЕ ЛЕНІНСКІ ЗАЛІК** ● ДА ДНЯ ПАДПІСАННЯ ДАГАВОРУ АБ ДРУЖБЕ ПАМІЖ БАЛГАРЫЯЙ І СССР ● **АГЛЯД НАСЦЕННАГА ДРУКУ** ● КНІГІ ТВАЙГО ВЫКЛАДЧЫКА

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

● № 10 (767) ● Пятніца, 20 сакавіка 1970 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIII



# ДА СТУДЭНТАЎ РЭСПУБЛІКІ

*ЗВАРОТ УДЗЕЛЬНІКАЎ ПЕРШАГА ЗЛЁТУ СТУДЭНТАЎ-ВЫДАТНІКАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.*

Таварышы! Нашы сэрцы, сэрцы маладых заусёды з партыяй. Яна дала нам правільны жыццёвы компас — усепераможнае вучэнне марксізма-ленінізма. У партыі вучымся мы беззапаветнай адданасці ідэям марксізма, бясстрашнасці у барацьбе за шчасце людзей працы, нянавісці да эксплуатацыі і класавага прыгнёту. Мы вучымся у партыі наватарству, арганізаванасці і дзелавітасці у паусядзённай рабоце. Камуністы натхняюць нас сваёй верай у будучыню, сваёй невычэрпнай рэвалюцыйнай энергіяй.

Нашы маці і бацькі прайшлі слаўны і цяжкі шлях. Яны не шкадавалі сябе у баі і працы дзеля будучыні, дзеля шчасця сваіх дзяцей. Гэты шлях быу адзначаны герaічнай Кахоукай і легендарным Сталінградам, белым тэрорам і кулацкім сабатажам, васьмушкай хлеба у рэвалюцыйным Петраградзе і працоўнымі мазалямі Магніткі, мноствам брацкіх магіл і заучаснай сівізной нашых маці. У тыя суровыя і вогненныя гады яны бачылі вышэйшы сэнс жыцця у вялікай пераўтваральнай працы, у беззапаветнай барацьбе за перамогу сацыялізма. І ніколі не сатруцца у памяці нашай подзвігі тых, хто сваёй крывёю і жыццём заплаціў за наша жыццё, хто сваімі рукамі ствараў шчасце для будучых пакаленняў. Узорам служэння народу, справе рэвалюцыі заусёды будзе для нас жыццё і дзейнасць правадыра працоўных Уладзіміра Ільіча Леніна.

Мы звяртаемся да вас у знамянальны час, калі савецкі народ з натхненнем працуе над ажыццяўленнем велічных планаў партыі камуністаў, паспяхова выконвае пяцігодку, імкнецца дастойна сустрэць 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна. Мы звяртаемся да вас, калі кожны малады чалавек, кожны камсамолец перад партыяй, перад народам, перад часам трымае Ленінскі залік.

Імя правадыра, якое носіць наш універсітэт, абавязвае нас з пачуццём асаблівай адказнасці аднесціся да вучобы, разглядаць яе як першы абавязак, як высокі доўг перад Радзімай, народам.

925 студэнтаў універсітэта здалі зімовую экзаменацыйную сесію толькі на выдатна, 3.000 — на добра і выдатна. На высокім ідэйным і тэарэтычным узроўні прайшла навуковая канферэнцыя па праблемах міжнароднага маладзёжнага руху, гісторыі ВЛКСМ і ЛКСМБ. На III Усесаюзны агляд студэнцкіх навуковых прац прадстаўлена больш 500 работ.

Гаворачы аб нашых поспехах, мы у той жа час добра разумеем, як многа нам неабходна яшчэ зрабіць. Сярод студэнтаў універсітэта ёсць яшчэ і такія, якія напярэдадні юбілею атрымалі нездавальняючыя адзнакі; значным з'яўляецца працэнт здавальняючых адзнак.

Мы звяртаемся да усіх студэнтаў рэспублікі напярэдадні усенароднага свята сканцэнтраваць свае намаганні на глыбокім засваенні праграмы спецыяльных дысцыплін, ператварыць застаўшыяся 38 дзён да 100-годдзя юбілею правадыра у дні прыкладнай, свядомай вучэбнай дысцыпліны, высокай паспяховасці.

Падрыхтоўка кваліфікаваных спецыялістаў арганічна звязана з камуністычным выхаваннем. Ідэйная перакананасць — крылы чалавека для імклівага і упэўненага палёту. Свядомыя адносіны да вялікай мэты прабуджаюць актыўныя імкненні стварыць усё для яе дасягнення. Мы павінны пастаянна памятаць, што савецкі студэнт — гэта актыўны грамадзянін вялікай Краіны Саветаў, а не адарваны ад жыцця і інтарэсаў свайго народа «акадэміст».

Мы заклінаем вас творча і глыбока засвойваць марксісцка-ленінскую тэорыю. Палітычная асвета не павінна ператварацца у калекцыяніраванне мёртвых ведаў, неабходнасць параіцца з Марксам, Энгельсам, Леніным не павінна з'яўляцца толькі як неабходнасць здаць экзамен, залік, напісаць рэферат, а як неабходнасць унутраная, заснаваная на перакананасці, што знойдзеш адказ на пытанне, якое цябе хвалюе.

Мы заклінаем вас развіваць грамадска-палітычную актыўнасць, фарміраваць у сябе арганізатарскія здольнасці, выхоўваць неабходнасць у працы, не разлічанай на матэрыяльную узнагароду. Кожны добры спецыяліст павінен быць грамадскім дзеячом.

Няхай кожны студэнт прыме удзел у трэцім семестры, падрыхтуе свой асабісты працоўны падарунак да 50-годдзя камсамола Беларусі.

Мы, удзельнікі злёту, выказваем цвёрдую упэўненасць, што студэнцкая моладзь рэспублікі новымі поспехамі у вучобе, сваімі грамадскімі справамі адкажа на высокае давер'е Радзімы, на клопаты партыі, будзе і надалей з гонарам выконваць вялікія запаветы Ільіча.

# па універсітэту

***

У сераду адбылося пасяджэнне аддзялення Таварыства савецка-балгарскай дружбы, на якім было абмеркавана пытанне аб рабоце аддзялення у мінулым годзе. У абмеркаванні прынялі удзел прафесары В. Р. Заурыеу, А. Я. Супрун, дацэнты Д. Б. Мельцар, Н. С. Гілевіч, А. А. Галаўко, ст. выкладчык В. П. Шапялевіч і дырэктар бібліятэкі Р. Г. Любіна.

Быу намечаны план мерапрыемстваў на 1970 год.

***

Справаздачна - выбарную канферэнцыю правялі універсітэцкія народныя кантралёры. Дэлегаты заслухалі і абмеркавалі даклад старшыні НК Е. М. Тагунова і выбралі новую групу народных кантралёраў.

*ПРАФСАЮЗНАЕ ЖЫЦЦЁ*

## КАОПАТЫ АБ ЗДАРОЎІ

У прафбюро факультэтаў паступаюць заявы прыкладна аднаго і таго ж зместу: «Прашу выдзеліць мне пуцёўку у студэнцкі прафілакторый». Жадаючых многа, звычайна больш, чым наяўных пуцёвак. Але у цэлым лічба суцяшальная. Толькі за студзень і люты у міжвузаўскім прафілакторыі папраўілі сваё здароўе 150 студэнтаў нашага універсітэта. На сакавік тым, хто мае у гэтым вострую неабходнасць, выдзелена ужо 75 пуцёвак.

А нядаўна на пасяджэнні прэзідыума прафкома спецыяльна разглядалася пытанне «Аб стане здароўя студэнтаў БДУ і меры па паляпшэнню медыцынскага абслугоўвання». Загадчыца медпункта Ф. Рэзнікава паведаміла, што у мінулым годзе рознымі формамі спартыўна-аздараўленчых мерапрыемстваў было ахоплена звыш 2.000 студэнтаў.

Здароўе — наш бясцэнны скарб, які патрэбна берагчы і шанаваць.

І таму, як расказаў намеснік старшыні прафкома М. Дрозд, у гэтым годзе, апрача пуцёвак у прафілакторый, студэнты нашага універсітэта атрымаюць 158 пуцёвак у дамы адпачынку і 63 — у санаторыі.

А. ПЯТРОЎ.

## ● ВЫХОЎВАЦЬ ПАЧУЦЦЁ КАЛЕКТЫВІЗМУ ●

18 сакавіка адбыўся пленум прафкома універсітэта, на які былі запрошаны старшыні студсаветаў інтэрнатаў, старшыні культурна-масавых камісій прафбюро факультэтаў, каменданты інтэрнатаў і прарэктар па адміністрацыйна - гаспадарчай частцы. На парадку дня стаяла пытанне «Аб стане палітыка-выхаваўчай работы і культуры паводзін студэнтаў у інтэрнатах № 1 і № 4». З дакладамі выступілі старшыні студсаветаў гэтых інтэрнатаў Аляксандр Гайдаманчук і Іван Нядзведскі. Яны адзначылі, што выкладчыцкі састаў і студсаветы праводзяць значную палітыка-выхаваўчую работу, набылі некаторы вопыт у фарміраванні у студэнтаў марксісцка-ленінскага светапогляду, высокай культуры паводзін, беражлівых адносін да сацыялістычнай маёмасці. У інтэрнатах добрай традыцыяй стала правядзенне вечароў-сустрэч з ветэранамі вайны і працы, з вядомымі людзьмі, актыўнымі змагарамі са Савецкую уладу. Тут часта чытаюцца лекцыі аб жыцці і дзейнасці У. І. Леніна. У інтэрнаце № 1 быў праведзены ленінскі вечар студэнтаў, які арганізавала дацэнт Н. П. Хрыпко.

Студэнцкія саветы прынцыпова і нецярпліва адносяцца да фактаў парушэння правіл супольнага жыцця у інтэрнатах. Да парушальнікаў дысцыпліны прымяняюцца строгія меры пакарання: нечарговыя дзяжурствы і нават высяленне з інтэрната. Так, з інтэрната № 4 выселена 12 чалавек, а з інтэрната № 1 — 3 чалавекі.

Садакладчыкі—член прэзідыума прафкома універсітэта А. І. Панарын, член палітыка-выхаваўчай камісіі мясцкома С. Е. Запатрын— і выступаючыя у спрэчках ускрылі, што у выхаваўчай рабоце сярод студэнтаў інтэрнатаў назіраецца шэраг істотных недахопаў. Не на поўную нагрузку выкарыстоўваюцца такія дзейсныя сродкі прапаганды, як радыёвузел, насценны друк. Не атрымалі шырокага распаўсюджвання формы калектыўнага адпачынку. А чаму б не арганізаваць масавы прагляд кінафільмаў у ленінскіх пакоях, папярэдне вызначыўшы іх тэматыку, наладзіць калектыўныя паходы у тэатры, канцэрты, а потым сумесна абмеркаваць убачанае і пачутае, падзяліцца уражаннямі? Карысць ад гэтага была б відавочнай.

І яшчэ. У інтэрнаты, здараецца, прыходзяць выкладчыкі. Але не з мэтай дапамагчы студсаветам і старастам у арганізацыі культурна-масавай работы, а толькі у якасці кантралёраў. Рэдкімі гасцямі у інтэрнатах бываюць куратары груп.

На пленуме усе прыйшлі да агульнай думкі: цэнтр увагі палітыка-выхаваўчай работы накіраваць у інтэрнаты. Тут жыве значная частка студэнтаў універсітэта, якія павінны цікава і змястоўна праводзіць свой вольны ад заняткаў час, мець камуністычную свядомасць і высокую ідэйную загартоўку.

А. ЗАБЕЛІН.



Злёт студэнтау-выдатнікау. Выступае рэктар універсітэта прафесар А. Н. Сеучанка.
Фота Ю. ЛЕБЕДЗЕВА.

# У АВАНГАРДЗЕ СТУДЭНЦКАГА РУХУ

Упершыню у актавай зале галоунага корпуса сабраліся выдатнікі вучобы, тыя, хто ідзе у авангардзе студэнцкага руху, актыуна удзельнічае у грамадскай рабоце, піша навуковыя працы, выступае з лекцыямі перад рабочымі і калгаснікамі.

Што ні кажы, а студэнты —народ вясёлы! Дзе студэнты, там і радасць, весялосць, песні, адчуванне нечага незвычайнага, цікавага. Вось так, некалькі незвычайна, пачауся першы агульнауніверсітэцкі злёт выдатнікау.

...Гучаць фанфары, чуецца бой курантау. У зале цішыня. Усе затаілі дыханне... І вось даносіцца знаёмы матыу «Міжнароднага гімна студэнтау». Ён змяняецца «Камсамольскай песняй».

Паяуленне на сцэне вядучых сустракаецца працяглымі апладысментамі. Яны чытаюць «Прамову У. І. Леніна на III з'ездзе РКСМ», якую напісау у 1926 годзе вядомы савецкі паэт Аляксандр Жарау. Затым зноу даносяцца знаёмыя матывы. Запальваецца святло. На сцэну падымаюцца члены прэзідыума сходу рэктар універсітэта А. Н. Сеучанка, намеснік сакратара парткома Г. Я. Рылюк, намеснік дэкана факультэта журналістыкі А. І. Раковіч, камсамольскія і прафсаюзныя актывісты У. Наумчык Л. Сабалеускі, М. Дрозд і іншыя.

Старшынствуючы У. Наумчык аб'яуляе першы злёт студэнтау-выдатнікау адкрытым. Урачыста уносяцца сцягі.

На трыбуне рэктар універсітэта, акадэмік АН БССР прафесар Антон Нікіфаравіч Сеучанка. Ён горача віншуе удзельнікау злёту, жадае ім і надалей такіх жа выдатных поспехау у вучобе і навукова-даследчай рабоце... Большасці удзельнікау злёту уручаюцца узнагароды ЦК ЛКСМБ, Мінскага абкома камсамола, Кастрычніцкага раённага камітэта ЛКСМБ, рэктарата, прафкома універсітэта.

925 студэнтау-завочнікау, якія былі запрошаны на злёт, прынялі праект палажэння аб выдатніках вучобы і зацвердзілі «Зварот да студэнтау рэспублікі». У першым з дакументау гаворыцца, што студэнты-выдатнікі, якія адначасова з'яуляюцца грамадскімі актывістамі, атрымаюць спецыяльныя пасведчанні з чырвонай вокладкай, на якой залатымі літарамі будзе напісана «Студэнт-выдатнік». Званне студэнта-выдатніка не толькі абавязвае быць актыуным у грамадскім жыцці, накладвае шэраг патрабаванняу, але і дае больш шырокія правы у параунанні з іншымі студэнтамі. Так, напрыклад, перад студэнтам-выдатнікам адкрыецца магчымасць самому, са згоды загадчыка кафедры, выбраць пажаданае месца вытворчай практыкі. Выдатнікі атрымаюць права свабодна наведваць лекцыі, за выключэннем лекцый і семінарау па грамадска-эканамічных дысцыплінах. Па жаданню яны могуць наведваць лекцыі па самых розных дысцыплінах, якія чытаюцца ва універсітэце, могуць здаваць па гэтых прадметах экзамены і патрабаваць, каб атрыманую адзнаку паставілі у дыплом.

Імёны выдатнікау вучобы на працягу усіх год навучання ва універсітэце заносяцца у Ганаровую кнігу камсамольскай славы БДУ. Павышаная стыпендыя ім назначаецца незалежна ад матэрыяльнага становішча. Акрамя таго, студэнтам-выдатнікам, якія займаюцца навукова-даследчай працай, па іх жаданню літаратура у бібліятэцы выдаецца звыш устаноуленай нормы. За лепшыя навуковыя працы, даклады, каштоуныя дыпломныя работы і курсавыя праекты яны узнагароджваюцца дыпломамі савета СНТ, Ганаровымі граматамі, а таксама грашовымі прэміямі.

Створана новая грамадская арганізацыя — савет выдатнікау, які будзе каардынаваць работу выдатнікау на усіх факультэтах універсітэта, дапамагаць навуковым гурткам, камітэту камсамола у рабоце з адстаючымі студэнтамі, распрацоуваць сумесна са студэнцкім навуковым таварыствам тэматыку напісання навуковых дакладау і работ.

**В. СВІРКО,**
член камітэта камсамола.

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

# БЫЦЬ ВЫДАТНІКАМ НЯЛЁГКА, АЛЕ...

**1. Што вас прывяло на факультэт, на якім займаецеся?**
**2. Цяжка быць выдатнікам?**
**3. Як праводзіце вольны час? Ці перашкаджае вучобе грамадская работа?**
**4. Студэнт-выдатнік. Якім ён павінен быць, на ваш погляд?**
**5. Нарадзілася новая традыцыя. Ваша думка наконт гэтага?**

**ЛЕАНІД ДАВЫДЗЕНКА,** студэнт III курса юрыдычнага факультэта:

1. Мара паступіць на юрыдычны факультэт у мяне з'явілася у час вучобы у Мінскім фінансавым тэхнікуме. Гэту мару я пранёс праз гады службы на Чарнаморскім флоце.

2. Я не сказау бы, што вельмі цяжка. Авалоданне спецыяльнымі прадметамі з'яуляецца як бы працягам вывучэння таго знаёмага, што дау мне тэхнікум.

3. У мяне, па праудзе кажучы, вельмі мала вольнага часу. Я — член партыйнага бюро факультэта, старшыня Уральскага абласнога штаба студэнцкіх будаунічых атрадау. Вельмі люблю оперны тэатр. І даводзіцца неяк усё сумяшчаць. Лічу, што грамадская работа нават дапамагае вучобе, апраудвае званне лепшага студэнта.

4. Да іх адносяцца людзі, якія свае словы заусёды падмацоуваюць справамі. На яго кладзецца большая адказнасць, таму што яго абавязак — аддаць людзям усё, што ён возьме за час вучобы ва універсітэце.

5. Гэта добрае пачынанне камітэта камсамола, хоць традыцыя магла нарадзіцца і раней. Думаю, што злёты акажуць уплыу на іншых студэнтау.

**МІЛА КАЗЛОВА, студэнтка IV курса біялагічнага факультэта:**

**1. Яшчэ у школе я марыла вучыцца на біялагічным факультэце, пазнаць тайны касмічнай біялогіі. Але, наступіўшы ва універсітэт, вырашыла, што больш карысці людзям прынясуць мае веды па біяхіміі. Займаюся даследаваннямі у галіне ракавых захворванняу: вельмі хочацца бачыць людзей здаровымі і шчаслівымі.**

**2. Для таго, каб стаць выдатнікам, патрэбны вялікія веды, таму даводзіцца вельмі многа займацца.**

**3. Захапляюся кіно. Многа чытаю. З'яуляюся членам камсамольскага бюро кафедры, узначальваю культмасавы сектар. Гэтай рабоце аддаю душу, бо сама люблю песні і танцы.**

**4. Перш за усё яго павінны паважаць таварышы. А для гэтага патрэбна, каб ён быу выдатнікам не толькі у вучобе, але і у жыцці.**

**5. Добрая, патрэбная традыцыя. Асабліва спадабауся праект палажэння аб выдатніках.**

*АЛЯКСАНДР ЖУК, студэнт IV курса біялагічнага факультэта:*

*1. Ва універсітэт паступіу адразу ж пасля школы, у 1962 годзе, але з другога курса мяне забралі у армію. Факультэт вельмі спадабауся, таму пасля службы з ахвотай працягваю вучобу.*

*2. Вядома. Адчуваеш адказнасць перад самім сабой і сваімі таварышамі.*

*3. Люблю грамадскую работу і ёй аддаю увесь свой вольны час. Цяпер з'яуляюся старшынёй прафбюро факультэта. Гэта не перашкаджае вучобе, а, наадварот, дапамагае.*

*4. Выдатнік павінен быць выдатнікам не толькі у вучобе, але і у грамадскай рабоце, бо універсітэт — гэта не толькі школа ведау, але і школа грамадскай работы.*

*5. Трэба развіваць і паглыбляць гэту традыцыю.*

**УЛАДЗІМІР ТЫВОРСКІ,** студэнт IV курса хімічнага факультэта:

1. Хіміяй пачау захапляцца у 11 класе, быу членам хімічнага гуртка, удзельнічау у алімпіядах.

2. Цяжка. Гэта цяжкасць у самой спецыфіцы факультэта: вельмі многа практычных заняткау.

3. Люблю музыку. Сам іграю на фартэп'яна. У апошні час захапляюся запісам музыкі класічнай і джазавай. А тое, што з'яуляюся старастам аддзялення, зусім не перашкаджае вучобе і не адымае шмат часу.

4. Займацца грамадскай работай, а галоунае, не адчуваць сябе нейкім асаблівым.

5. Трэба запрашаць на такія злёты не толькі выдатнікау, але і іншых студэнтау.

**Інтэрв'ю правялі А. ЛАМЕКА І Л. ПЕРАСЫПКІНА.**

# РАСКАЗВАЮЦЬ СТУДКОРЫ

**Інтэрв'ю, якія мы прапануем вашай увазе, запісала наш студкор Ніна МАРАДУДЗІНА.**

Першым маім субяседнікам быу выдатнік вучобы студэнт I курса фізічнага факультэта Нгуен ван Мінь. Ён паведаміу мне наступнае:

— У 1968 годзе закончыу дзесяцігодку у Ханоі. У ліку найбольш паспяхова здаушых экзамены быу накіраваны на вучобу у Савецкі Саюз. Асабліва цяжкім для мяне быу першы год навучання ва універсітэце.

Цяпер значна лягчэй. Але працаваць даводзіцца шмат — выдатнікам быць нялёгка.

**— А як вы праводзіце свой вольны час?**

— Мяне вельмі цікавіць жыццё студэнтау нашага факультэта, таму часта выконваю асобныя даручэнні. Чым магу дапамагаю таварышам у вучобе. Захапляюся валейболам. З задавальненнем чытаю рускія кнігі. Асабліва люблю Чэхава. Акрамя усяго гэтага, я кінааматар.

## ЗДОЛЬНАСЦІ І МАГЧЫМАСЦІ

**— Ці дауно у вас з'явілася мара стаць фізікам?**

— Яшчэ у восьмым класе сярэдняй школы я вырашыу сур'ёзна займацца фізікай. Цяпер я бясконца шчаслівы, што мара мая здзяйсняецца.

* * *

Яшчэ я сустрэлася з Аляксандрам Міхальчанкам, студэнтам факультэта журналістыкі, камсоргам I курса.

**— Якім чынам можна дасягнуць выдатных поспехау у вучобе?**

— Дзякуючы строгаму размеркаванню рабочага дня, прадукцыйнасці працы. Пры правільным размеркаванні часу ёсць магчымасць і добра вучыцца, і займацца грамадскай работай, спортам.

**— У такім разе, як вы адносіцеся да выказвання старажытнагрэчаскага байкапісца Эзопа: «Калі чалавек бярэцца за дзве справы адначасова, дык ні адна з іх яму не удаецца»?**

— Не, не згодзен, калі гутартка ідзе аб сумяшчэнні вучобы, грамадскай работы і спорту. Як вядома, камсоргу курса даводзіцца працаваць нямала. Акрамя гэтага, я пастаянна займаюся спортам — маю разрад па бегу і трохбор'і. Як бачыце, гэта не перашкаджае вучобе.

**— Якім вы, Саша, уяуляеце сабе студэнта праз некалькі стагоддзяу?**

— Фізічна больш дасканалым. А значна большы аб'ём інфармацыі будзе засвайвацца за кошт найбольшага выкарыстоування рэзервау мозгу. Вядома, што Луі Пастэр, у якога была паралізавана частка мозгу, рабіу вялікія адкрыцці. Думаю, што гэта прыклад не толькі геніяльнасці вучонага, але і наглядны прыклад найбольшага выкарыстання здольнасцей пры вымушаных абставінах.

# ЗВЯРАЮЧЫ КРОК

Чырвоная кніжачка з сілуэтам Ільіча...

Авеяная славай баёу, праслауленая гераічнай працоуных будняу, прабітая свінцом Айчыннай вайны, прапахшая вятрамі адкрыццяу, рамантыкі, перамог і знаходак — ты заусёды клікала маладыя сэрцы на подзвіг, запальвала іх агнём, асвятляла шляхі, як палаючае сэрца Данка...

На розных этапах жыцця не аднойчы камсамолец пытау у свайго сумлення: «Ці дастойны я насіць камсамольскі білет? Ці тым шляхам я іду, на які указау нам Ільіч? Ці жыву я ленінскімі запаветамі?»

Цяпер, у год юбілею У. І. Леніна, аб гэтым пытае сябе кожны савецкі чалавек. Такая мэта і Ленінскага заліку. А сумленне тваё, камсамолец, — таварышы, людзі, з якімі жывеш, вучышся, марыш. Іх адкрытыя, сумленныя словы скажуць, чаго ты варты як чалавек, як змагар, як ленінец.

Такая шчырая размова атрымалася у камсамольцау першага курса першай групы факультэта журналістыкі, якім выпау гонар першым на факультэце здаць Ленінскі залік і атрымаць заліковыя кніжкі удзельніка Усесаюзнага Ленінскага заліку.

— Камсамолец Драгавец...

Высокі юнак парывіста падымаецца з месца. Ён стараецца быць спакойным, але ж нялёгка схаваць хваляванне.

Камсорг першай групы Аляксандр Бушэнка зачытвае характарыстыку. У ёй няма нічога, што паказвала б на адмоуныя бакі характару, тым больш — учынкі. І сапрауды Васіль заслугоувае такой характарыстыкі. Выдатна працавау ён на уборачных работах у калгасе, сур'ёзна, з поунай аддачай адносіцца да вучобы, добрасумленна і дапытліва вывучае працы Леніна. Яго даклады на семінарскіх занятках заусёды вызначаліся глыбінёй, лагічнай паслядоунасцю і дакладнасцю. Прымае Васіль удзел у двухгодцы «Камсамол — сельскай школе», актыуна удзельнічае у жыцці курса.

— Дапауненні да характарыстыкі будуць?

— Не, усё правільна!

Пытанне камісіі па здачы заліку:

— Першы пункт Ленінскага заліку. Вашы асабістыя абавязацельствы і ход іх выканання?

— Лічу, што абавязацельствы не выканау: давау слова здаць сесію на добра, а маю тройку...

Маучанне. Дапытлівыя, уважлівыя, патрабавальныя позіркі сяброу. Гэта яны рашаюць сёння лёс кожнага...

Зноу пытанне камісіі:

— Веданне ленінскай спадчыны і класікау марксізма-ленінізма. Маецца на увазе здача экзамена па гісторыі КПСС. Як выканалі вы гэты пункт?

— Па гісторыі партыі я атрымау выдатна, хоць брау абавязацельства здаць на добра.

Камісія раіцца. Яе рашэнне—паставіць залік па двух пытаннях. Але галоунае — голас таварышау, а не камісіі...

Пачынаецца галасаванне. Спачатку маучанне, а пасля усе паднялі камсамольскія білеты. Галасавалі усе.

ГОДДЗЯ УНІВЕРСІТЭТА

# ТА БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ



Входной билет

на торжественное заседание, посвященное откры-тию Белорусского Государственного Университета

11 июля 1921 г.

в клубе КАРЛА МАРКСА.

Начало в 7 ч. веч.

*У красавіку 1921 г. пытанне аб адкрыцці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта спецыяльна абмяркоўвалася на III сесіі ЦВК БССР. Ажыццяўляючы рашэнні сесіі, Прэзідыум ЦВК БССР 17 красавіка прыняў пастанову, якая пацвярджала дэкрэт ад 25 лютага 1919 г. і аб'яўляла адкрыццё ўніверсітэта тэрміновай і ўдарнай задачай. ЦВК БССР абавязаў народныя камісарыяты і Савет народнай гаспадаркі аказаць універсітэту ўсемагчымую дапамогу.*

*Каб забяспечыць доступ ва ўніверсітэт рабочым і сялянам, у чэрвені 1921 г. быў адкрыты першы факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта — рабочы факультэт (рабфак). На гэты падрыхтоўчы факультэт у першы набор было прынята 69 рабочых, 72 селяніна і 19 чырвонаармейцаў. Да восені лік студэнтаў павялічыўся да 285.*

*11 ліпеня 1921 г. адбыўся ўрачысты сход партыйных, савецкіх і грамадскіх арганізацый, прысвечаны адкрыццю Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Назначаны ў клубе імя Карла Маркса, ён быў перанесены ў будынак гарадскога тэатра і прайшоў як вялікае свята беларускай савецкай культуры.*

*Першыя словы гарачага прывітання і сардэчнай удзячнасці ад імя працоўных Савецкай Беларусі ўрачысты сход паслаў У. І. Леніну. У прывітальнай тэлеграме гаварылася: «Адкрываючы ў дзень вызвалення Мінска — цэнтра Беларусі — Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, урачысты сход, прысвечаны яго адкрыццю, ад імя партыйных, рабочых, культурных і грамадскіх сіл краю шле Вам, дарагі правадыр, свае гарачае прывітанне».*

*У сваіх выступленнях прадстаўнікі партыйных, савецкіх і грамадскіх арганізацый падкрэслівалі, што адкрыццё ўніверсітэта з'яўляецца для Беларусі вялікай гістарычнай падзеяй, што ўніверсітэт павінен накіраваць сваю вучэбную і навуковую дзейнасць так, каб яна служыла справе рэвалюцыі, справе рабочага класа. няткаў.*

*Універсітэт адкрываўся ў складзе трох факультэтаў: рабочага, медыцынскага і грамадскіх навук. Прыёмная камісія залічыла ў студэнты медыцынскага факультэта 293 чалавекі, факультэта грамадскіх навук — 736 чалавек.*

*30 кастрычніка 1921 г. адбылася ўніверсітэцкая ўрачыстасць, на якой пасля ўступнага слова рэктара прафесар І. М. Салаёў прачытаў даклад «Мысленне і мова». З прывітальнымі прамовамі выступілі прадстаўнікі партыйных і савецкіх арганізацый, а таксама навучальных устаноў. Урачыстасць закончылася абвяшчэннем шматлікіх прывітальных тэлеграм.*

*Дзень 30 кастрычніка 1921 г. з'яўляецца днём фактычнага адкрыцця Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. З 31 кастрычніка на ўсіх факультэтах пачаліся рэгулярныя вучэбныя заняткі.*

*Е. АБЕЦЭДАРСКАЯ.*

# КНІГА АБ ТРЫВОЖНАЙ МААААДОСЦІ

25 верасня гэтага года спаўняецца паўвека камсамолу нашай рэспублікі. Чым далей адыходзіць у мінулае дзень яго нараджэння, тым часцей, імкнучыся ў будучыню, рупліва юнацтва звяртаецца да багатага гістарычнага вопыту, накопленага моладдзю ў першай палове нашага бурнага стагоддзя. Узнікшы як вынік сацыяльных зрухаў, на грэбені рэвалюцыйнай хвалі, загартаваўшыся ў жорсткіх баях з кайзераўскімі захопнікамі, белапольскімі акупантамі, бандытамі Савінкава, Булак-Булаховіча і іншых завугольных драпежнікаў, камсамол рэспублікі высока ўзняў сцяг свабоднай камуністычнай моладзі. Гэтымі думкамі пачынаецца кніга прафесара А. Е. Журава «Пад кіраўніцтвам партыі», якая выйшла нядаўна ў выдавецтве «Беларусь». Аўтар паставіў перад сабой задачу даследаваць і паказаць чытачу, як пад кіраўніцтвам партыі Ленінскі камсамол Беларусі рос і мацнеў у складанай барацьбе на ваенных, палітычных і эканамічных франтах. Перад аўтарам стаяла адказная задача гістарычнага і маральнага парадку — не толькі скрупулёзна даследаваць суровую школу камсамола рэспублікі, паказаць спецыфіку дзейнасці першых ячэек, але і аднавіць гэта ў памяці ўдзельнікаў тых падзей, а моладзі даць аб'ектыўнае веданне слаўнай гісторыі.

Цяжка даваліся камсамолу першыя крокі, адзначае А. Е. Жураў. Бальшавіцкія камітэты пасля рэвалюцыі імкнуліся павесці за сабой моладзь рабоча-сялянскага паходжання, якая прагла «рамантыкі бою» і ўжо зарэкамендавала сябе ў рэвалюцыйных выступленнях. Пазней маладыя байцы рэвалюцыі ваявалі на ўсіх франтах, нябачаным гераізмам і мужнасцю наводзячы страх на шматлікіх ворагаў. Стаяў насмерць разам з чырвонымі часцямі камсамольскі атрад пад Вільняй. У асіповіцкіх і дукорскіх лясах не давалі спакою белапалякам партызаны.

Легендарнай стала моладзь Слуцка, якая ішла на расстрэл, спяваючы: «Вы жертвою пали»... Старонкі кнігі, дзе аўтар вядзе размову аб барацьбе моладзі з замежнай інтэрвенцыяй і ўнутранай контррэвалюцыяй, уяўляюць найбольшую цікавасць. Камсамол рэспублікі правёў тры ўсеагульныя мабілізацыі, аддаў фронту большасць свайго саставу. А. Е. Жураў прыводзіць шматлікія красамоўныя факты. Напрыклад, 4-я рота Мінскага караульнага батальёна была поўнасцю камсамольскай. Пілсудчыкі кідалі супраць яе свае лепшыя сілы. А калі пад Радашковічамі рота прыкрывала адыход батальёна, яна панесла вялікія страты, але ні на крок не адступіла са сваёй пазіцыі.

Наогул, на нашу думку, адметнай і каштоўнай рысай выдання з'яўляецца тое, што аўтар у гістарычныя факты і падзеі ўдыхнуў жыццё. За імі стаяць жывыя людзі са сваімі імёнамі і багатымі біяграфіямі. Такая форма падачы матэрыялу надае дынамічнасць, вабіць чытача сваёй канкрэтнасцю. Кожны з задавальненнем і гордасцю прачытае пра дзейнасць першых камсамольцаў свайго сяла, горада, сустрэне імёны знаёмых людзей, многія з якіх яшчэ могуць расказаць моладзі нямала захапляючых гісторый з біяграфіі нашых бацькоў.

Але аўтар разумеў, што стварыць гераічны фон яўна недастаткова для паўнаты гістарычнай канкрэтнасці і праўдзівасці. Яго хваляваў і другі бок справы — высветліць сапраўдныя шляхі стварэння камсамола ў нашай рэспубліцы. Гэта ўдалося вучонаму ў поўнай меры і ў першую чаргу таму, што ён выкарыстаў вялікі фактычны матэрыял архіваў і бібліятэк не толькі Мінска, але і Ленінграда, Масквы, Смаленска і шматлікую літаратуру па гісторыі камсамола.

А. Е. Жураў поўнасцю выкрыў беспадстаўнасць спроб даказаць, што нацыяналістычныя арганізацыі з'яўляюцца нібыта асновай камсамола, і даказвае лёгкадумнасць і суб'ектывізм гэтых вывадаў. На аснове аналізу дакументаў, успамінаў удзельнікаў тых падзей аўтар паказвае, як у 1917 годзе ў Беларусі актывізавалі дзейнасць нацыяналістычныя партыі і арганізацыі, а бундаўцы пачалі ствараць арганізацыі моладзі. У Мінску, Гомелі, Віцебску, Бабруйску з'явіліся арганізацыі Югенд-бунд, у Слуцку — «Беларуская хатка», у некаторых вёсках — эсэраўскія «культурна-асветныя гурткі». У Віцебску быў створаны Югенд-ферэйн, які з самага пачатку аказаўся пад уплывам бунда, усё больш і больш загразаючы ў нацыяналістычнае балота, і канчаткова выкрыў сябе перад працоўнай моладдзю, калі 18 ліпеня 1917 года прыняў удзел у дэманстрацыі, арганізаванай эсэрамі, меншавікамі і бундаўцамі ў падтрымку Часовага ўрада. Партыя звярнула сур'ёзную ўвагу моладзі на гэта. Пры камітэтах партыі ўзнікаюць арганізацыі «Чырвоная моладзь», «Юныя бальшавікі», «Групы дапамогі Савецкай уладзе», якія павялі барацьбу з нацыяналістамі.

А. Е. Жураў праілюстраваў складаны працэс змагання першых ячэек за права свайго існавання, барацьбу, якая перапляталася з жорсткімі баямі на ідэйным фронце. Аўтар прадстаўляе на суд чытача багаты матэрыял, на шматлікіх прыкладах паказвае, як камсамол змагаўся з варожымі арганізацыямі, выкрываў дзейнасць скрытых нацыяналістаў.

Адзін з раздзелаў кнігі А. Жураў прысвяціў выпрацоўцы арганізацыйных прынцыпаў будовы камсамола, вялікай прапагандысцкай працы яго сярод насельніцтва, дзе паказвае вытокі вялікай актыўнасці і грамадскай мэтанакіраванасці камсамольцаў 20-х гадоў. Уменне выкарыстоўваць самыя разнастайныя формы і метады працы, у самы кароткі час ствараць вакол любой справы грамадскую думку, даводзіць яе важнасць да свядомасці кожнага чалавека, і, галоўнае, карысная аддача мерапрыемстваў — прыклад для пераймання сучаснай моладдзю. Аўтар імкнуўся паказаць найбольш эфектыўныя бакі работы камсамола, якія не ўстарэлі і ў нашы дні.

Не менш яскрава адлюстраван у кнізе ўдзел камсамола ў гаспадарчым будаўніцтве.

Выйшла каштоўная, патрэбная і своечасовая кніга «Пад кіраўніцтвам партыі» — першае грунтоўнае даследаванне аб узнікненні і станаўленні камсамола нашай рэспублікі. Яна будзе прыхільна сустрэта шырокім колам чытачоў, студэнтаў, настаўнікаў і камсамольскімі работнікамі — усімі, хто цікавіцца гісторыяй нашай рэспублікі.

**А. СЛУКА,**
**аспірант факультэта журналістыкі.**

# АДКУЛЬ ПАЙШЛО?

**Все к лучшему в этом лучшем из миров.**

Изречение это заимствовано из романа Вольтера «Кандид».

**Гарпагон.**

Герой комедии Мольера «Скупой» (1668), у которого страсть к накоплению приняла патологический характер. Имя его стало нарицательным для людей подобного типа.

**Все куплю,—сказало злато;**
**Все возьму,—сказал булат.**

Цитата из стихотворения А. С. Пушкина «Золото и булат» (1827).

**Герострат.**

Герострат — уроженец г. Эфеса (Малая Азия) — из честолюбия обессмертить свое имя сжег в 356 г. до н. э. великолепный храм Артемиды Эфесской, который считался в древнем мире одним из «семи чудес света». Суд приговорил Герострата к смерти, имя его было запрещено произносить. Но, несмотря на запрещение, греческий историк Феопомп (IV в. до н. э.) сохранил потомству его имя. Труды Феопомпа, уцелевшие в отрывках, послужили источником для позднейших историков (Страбон, Авл Гелий, Валерий Максим). Имя Герострата стало нарицательным для честолюбца, добивающегося славы любым путем, вплоть до преступления, не останавливающегося перед разрушением культурных ценностей. Выражение «геростратовская слава» употребляется в значении: позорная слава.

**Голубой цветок**

Выражение восходит к роману немецкого романтика Новалиса (1772—1801) «Генрих фон Офтердинген». Оно, ставшее лозунгом романтиков, в литературной речи получило значение несбыточной мечты, неосуществимого идеала.

**Да, жалок тот, в ком совесть не чиста.**

Цитата из трагедии А. С. Пушкина «Борис Годунов» (1831), сцена «Царские палаты», слова Бориса.

**Двуликий Янус.**

В римской мифологии Янус — бог времени, а также всякого начала и конца, входов и выходов — изображался с двумя лицами, обращенными в противоположные стороны: молодым—вперед, в будущее, старым — назад, в прошедшее. Возникшее отсюда выражение «двуликий Янус» или просто «Янус» означает: двуличный человек.

**Душечка.**

Героиня одноименного рассказа А. П. Чехова (1899), бесхитростная женщина, меняющая свои интересы и взгляды по мере смены возлюбленных, глазами которых она смотрит на жизнь. Образом чеховской «душечки» характеризуются люди, меняющие свои убеждения и взгляды в зависимости от того, кто в данное время оказывает на них влияние.

**Если голова пуста,**
**То голове ума не придадут места.**

Цитата из басни И. А. Крылова «Парнас» (1808).

**Есть, чтобы жить, а не жить, чтобы есть.**

Афоризм этот принадлежит Сократу (469—399 до н. э.).

**Еще одно, последнее сказанье,**
**И летопись окончена моя.**

Цитата из трагедии А. С. Пушкина «Борис Годунов». Употребляется в значении: последнее замечание, последнее слово.



**Нядаўна на падрыхтоўчым факультэце прайшоў агляд мастацкай самадзейнасці замежных студэнтаў, прысвечаны ленінскаму юбілею. У канцэртных праграмах былі не толькі песні і танцы В'етнама, але і творы рускіх і беларускіх кампазітараў.**

**Хутка са сваімі лепшымі нумарамі в'етнамскія студэнты выступяць на прадпрыемствах і ва ўстановах сталіцы рэспублікі.**

Фота **М. Нечыпарэнкі.**

В. а. рэдактара А. СВОРАБ.

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т 22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2000 экз. Зак. 407. АТ 22060.